Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem.

№ 29 (58) Чацьверг, 8-га верасьня 1927 г. м. Вільня. Год II.

Беларускае Слова

Выход... раз у тыдзень

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальн... ...яльная і культурна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократ... ...м.—Нацыянальная царква.—Краевая згода. Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй

Падпі...

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Zawalna 6 m. 4
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: На 1 старане —20 гр.
„ У тэксце . —40 гр.
„ На 4 старане —15 гр.
За кожны мілім. шырыны ў 1 шпальту.
Старана мае 8 шпальтаў.

Час надыйшоў

2 месяцы таму беларускае грамадзянства чэсна і дружна споўніла свой грамадзкі абавязак: не гледзючы на пасьпех, з якім выбары рабіліся адміністрацыйнымі ўладамі, як беларускія мястэчкі, так, галоўным чынам, беларуская вёска далі нам, беларусам, вялікую перамогу. На выбарах да самаўрадаў Беларускі Народ яшчэ раз даказаў, што Ён існуе, што Ён ведае, чаго хоча і што Ён прызнае de facto дзяржаўныя рамкі Польскае Дзяржавы і ў гэтых рамках вядзе змаганьне за свае правы. І мы, прызнаючыя зусім адкрыта польскую дзяржаўнасьць, гэтак-жа адкрыта і энэргічна змагаліся падчас выбараў за сваіх беларускіх радных.

Мы не рабілі ніякіх штучных камбінацыяў, мы ня йшлі на запятках расейцаў, мы не рабілі польска-жыдоўска-беларускай комуністычнай мешаніны: — мы йшлі з сваім уласным — *нацыянальным* сьпіскам і мы перамаглі!

Але гэта ёсьць толькі *частка* перамогі.

Калісь, 5 гадоў назад, Беларускі Народ гэтак-жа перамог, даўшы першых беларускіх паслоў... Але якое горкае разчараваньне сяньня у тых выбаршчыкаў, якія гэтых паслоў 5 гадоў назад выбіралі!

Дык каб гэтага разчараваньня ў сваіх выбранцах не зьявілася-б і ў нас пасьля 3 х гадоў, калі скончыцца час трываньня самаўрадаў, — трэба загадзя, сяньня яшчэ аб гэтым падумаць. Рада на гэтае ёсьць толькі адна: гэта 1) зарганізаванасьць беларускіх радных і 2) жывая іх сувязь і кантакт з народам.

Беларускія паслы акурат гэтых двух неабходных варункаў не датрымалі: бо заместа еднасьці—пабіліся на паасобныя групкі, якія толькі ўвесь час змагаліся адна з адной і заместа рэальнай працы для народу і з народам — гулялі ў высокую палітыку.

Мінулыя два месяцы былі гарачай гаспадарчай парой для нашай вёскі. Цяперака уборка збожжа скончылася, падыходзіць спакайнейшая пара, і *ўсе* беларускія радныя, *якім дарагая і блізкая нацыянальная нашая ідэя*, якія хочуць направы свайго цяжкага вясковага жыцьця, павінны прыняцца далей за выкананьне свайго грамадзкага абавязку.

Зноў кажам: мала таго, што мы паправодзілі ўсюды нашых беларусоў, мала таго, што мы маем сваіх першых беларускіх войтаў — мы павінны нашую грамадзка — самаўрадавую працу рабіць далей. Гэтая праца павінна складацца з трох элемэнтаў: 1) народу, 2) выбранцаў народу — радных і 3) кіраўнічага цэнтру — камітэту да спраў самаўрадаў, зложанага з радных. Гэтыя ўсе элемэнты ёсьць! Есьць сьвадомы Беларускі Народ, ёсьць нашыя беларускія выбранцы, ёсьць гэты цэнтр — „Беларускі Камітэт па справам самаўрадаў“.

І што гэты камітэт патрэбны, аб гэтым ясна сьведчаць першыя крокі, першыя непрыемнасьці нашых выбранцаў. Бо ці-ж мо... ...м сумліў у тым, што каб не жыва... ...язь „камітэту“ з сваімі сябрамі, а у сваю чаргу кантакт камітэту з тымі беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі, якія фактычна бароняць на дзеле беларусоў, дык адзін з першых беларускіх войтаў яшчэ доўга пакутаваў-бы ў турме. На ягоную бедную галаву услужлівая перад шовіністычнымі абшарнікамі павятовая паліцыя панапісывала гэткія рэчы, што за іх сядзець яму прыйшлося-бы амаль ня ўсё сваё жыцьцё!... Але камітэт першы адкрыта падняўся на абарону былога свайго інструктара, а потым войта і, падтрыманы Бел. Нац. Радай, праз 2 дні вызваліў Пятровіча з турмы, а сяньня Пятровіч ужо рэабілітаваны пракурорскай уладай ува ўсіх тых „праступленьнях“, аб якіх гэтак многа пісаў павятовы маладэчанскі камэндант.

Дык радныя беларусы! Памятайце, што адзінай Вашай арганізацыяй, якая з Вамі працавала падчас выбараў, і якая ідзе да Вас з рэальнай дапамогай ня толькі ў бядзе, але прыйдзе і пад час штодзеннай творчай працы — ёсьць „Беларускі Камітэт па справам самаўрадаў“.

Дык гуртуйцеся каля гэтага камітэту для цяжкай працы, на якую вас заклікае абавязак перад нашым Народам і перад нашай Ідэяй!

Палітычны агляд.

У апошні час на палітычным небасхіле здарылася некалькі мала прыметных з вонкавага боку палітычных выпадкаў, якія між тым вельмі характэрны для перажываемага момэнту. На першым мейсцэ трэба паставіць

няўдачу бальшавікоў у перагаворах з амэрыканскім нафтавым трэстам,

ад ча... залежыць далейшы лёс савецка амэрыканскіх адносінаў. Пасьля разрыву з Англіяй бальшавікі ўсялякаю цаною хацелі схіліць на свой бок амэрыканскіх капіталістаў. Гэтым дасягалася двоякая мэта: папершае, можна было-бы рахаваць на атрыманьне амэрыканскай пазыкі і па — другое — павялічылася-б рожніца між Англіяй і Амэрыкай. Але да гэтага не дайшло. Вельмі глыбока мыляцца бальшавікі, думаючы, што загранічныя капіталісты паставілі крыж на аграбленыя бальшавікамі загранічныя капіталы ў Расеі. З гэтай прычыны ня рушыліся з мейсца гандлёвыя перагаворы з Францыяю і аб гэта разьбіліся перагаворы з амэрыканскім нафтавым трэстам Стандар Ойль К-о, якому бальшавікі хацелі выдаць у арэнду на 15 гадоў бакінскія нафтавыя крыніцы. Раней чым прыступіць да рэалізацыі гэтай умовы, амэрыканскія капіталісты патрэбавалі ад бальшавікоў зьвярнуць вартасьць аграбленай ў Баку у часе кастрычнікавай рэвалюцыі маемасьці амэрыканскіх грамадзян, бо якую яны могуць мець гарантыю, што бальшавікі зноў не аграбяць амэрыканскія капіталы, як толькі яны будуць зьмешчаны ў расейскія прадпрыемствы. Зусім зразумела, што бальшавікі адмовілі амэрыканцам у гэтым іх жаданьні, бо ў праціўнам выпадку ім прыйшлося бы зьвярнуць тое, што яны аграбілі у англійскіх, францускіх, бэльгійскіх, швэйцарскіх і іншых грамадзян. Апрача ўсяго іншага яны не пасядаюць для гэтага належных сродкаў. І дзеля гэтага бальшавікам прыйшлося пазбавіцца апошняй надзеі зачапіцца за сьвятовы капітал, каб ратаваць сваё эканамічнае становішча, якое горшае з кожным днём.

Другім паважным палітычным фактам зьяўляецца


выхад у дымісію сталага прадстаўніка Англіі у Лізе Народаў лёрда Робэрта Сэсіля,

які шмат палажыў працы на ўзмацненьне аўтарытэта Лігі і сьвятовага міру. Выхад з Лігі яго, як роўным чынам і сталага прадстаўніка Францыі сэнатара Жувэнэля, указвае на тое, што Ліга Народаў перажывае цяжкі унутраны крызыс. Лёрд Робэрт Сэсіль апрача гэтага выйшаў і з складу сябраў кабінэту Бальвіна, у якім ён займаў становішча міністра без партфэлю. Выйшаў ён з поваду папярэчнасьці паглядаў яго і рэшты кабінэту на справы міра, што асабліва уяўнілася на марской канфэрэнцыі трох у Жэнэве. Сэсіль — ідэаліста. І дзеля гэтага ён ня мог заставацца далей на сваім становішчы бязпомацнага глядзельшчыка, бачучы, што Ліга Народаў не спаўняе свайго заданьня.

Значна больш шуму

зрабіў сваею прамоваю Жувэнэль на міжпарлямэнтскім кангрэсе ў Парыжу,

у якой выразіў відавочна цяперашняю эўрапэйскую палітычную сытуацыю. Ен ня



Збліжаецца новая сэсыя парлямэнту..
(„Robotnik“).

верыць у магчымасьць „лёкалізаваць“ канфлікты. Няхай толькі выбухне дзе небудзь ваенны канфлікт, як ён тойчас абярнецца ў агульны, як гэта было ў 1914 г. Калі толькі выбухне дзе небудзь канфлікт, ніхто ня можа лічыць сябе ў нябясьпецы. Калі ўсе не аб'яднаюць высілкаў, каб загасіць палячаеся дзерава — дык скажыце: прашчай лес! Лёкарна падзяліла Эўропу на дзьве часткі: заходняю, дзе status quo (істнуючае становішча) гарантавана вялікімі дзяржавамі і усходняю, дзе status quo ня прызнана і дзе вартаўніком і гарантыяй міра зьяўляецца адна Францыя. Гэты дуалізм тым небясьпечны, што Нямеччына ў 1926 г. падпісала дагавор з радавай Расеяю. Цяпер Нямеччына ў Радзе Лігі Народаў, ад якой патрабуецца аднагалоснасьць пры усякіх пастановах. І калі-б бальшавікі напалі на аднаго з сваіх суседзяў, дык вэта адной Нямеччыны можа паралізаваць уладу Лігі Народаў і пазбавіць дзейнасьці. Затым ён лічыць, што

перашкодаю для раунавагі ў Эўропе зьяўляецца вонкавая палітыка Саветаў.

Паводле яго пагляду неабходна вырашыць эўрапэізацыю радавай вонкавай палітыкі шляхам націску на яе іншых дзяржаваў. Разрыў Англіі з Радамі Жувэнэль прызнае першым крокам для такога агульнага націску. Гэты націск Жувэнэль не разумее ў сэнсі ваеннага паходу проці саветаў, а ў стварэньні агульнага фронту эурапэйскіх дзяржаваў супольна з Нямеччынаю проці саветаў, які павінен паставіць бальшавікам варункі, аналёгічныя тым, якія паставіла Англія. Эканамічная адбудова Расеі, гэтак патрэбная для ўсей Эўропы, немагчыма без загранічных пазык, без загранічных капіталаў. Але гэткі заём радаваму ураду можа даць толькі Ліга Народаў з тым, каб у Расеі быў уведзен кантроль над выдаткамі тых сумаў, якія будуць выданы Гэткім чынам пагляды Жувэнэля зусім сходзяцца з цяперашняю палітыкаю Англіі у адносінах Радавай Расеі. І, ня гледзячы на вялікую разьбежнасьць інтарэсаў эўрапэйскіх дзяржаваў, усё складаецца на карысьць стварэньня гэткай агульнай згоды.

Нямеччына з кожным днём усё больш сьцюдзянее да саветаў,

ня гледзячы на тое, што цяпер найлепшы момэнт для захапленьня выключнага прывілігіраванага палажэньня ў Расеі Наадварот, заметна ўсё большае зьбліжэньне яе з Францыяй і Англіяй Незалежна ад пагрозаў нямецкіх нацыяналістаў Англія і Францыя рашылі яшчэ зьменшыць акупацыйныя войскі на Рэйне на 10,000 чалавек Толькі што падпісаны француска-нямецкі гандлёвы дагавор, які паложыць фундамэнт пад палітычнае зьбліжэньне. Няўдача бальшавікоў у перагаворах з амэрыканскімі нафтавымі каралямі аслабіць канкурэнтную барацьбу між амэрыканскімі і эурапэйскімі нафтавымі трэстамі, за сьпіною якіх стаяць Амэрыка і Англія і разрадзіць згусьціўшуюся палітычную атмасфэру.

Адначасна

радыкальна зьмянілася сытуацыя і ў Кітаі.

Акрутны гэн. Шэк, быўшы дыктатар кантону, замест таго, каб парашыць з адным з сваіх ворагаў — камунізуючым Ханькоў, і ўзмацніць сваю пазыцыю, пачаў бязсэнсовы свой паход проці Пэкіна, як адзінага антыкамуністычнага цэнтру. Гэта дало магчымасьць аправіцца ханькоўскай арміі, якая скора пачала паважна пагражаць тылу і флангу арміі Шэка. А затым Шэк не прадбачыў яшчэ аднаго, вельмі прыкрага для сябе факту: быўшы бальшавіцкі прыхільнік, камандзір мангольскай арміі гэн Фэнг, замест наступленьня на Пэкін проці арміі Чанг-Тса-Ліна, ударыў ва фланг арміі гэн. Шэка. Гэткім чынам стварылася для пэкінскай арміі настолькі спрыяючыя абставіны, што яна без вялікіх высілкаў ня толькі устрымала пераможны паход палуднёвай арміі гэн. Шэка, але наадварот, нанясла ей рашучы удар і адкінула за р. Ян-Тсэ-Кіянг, фарсіраваўшы яе у некалькіх местах і захапіўшы Нанкін. Дзеля гэтага гэн. Шэк прымушаны быў адрачыся ад свайго становішча і ратавацца ўцечкаю да Японіі, а ў тылу яго арміі пачаліся хваляваньні і непарадкі. Цяпер ідзе рашучая барацьба за апошні апорны пункт палуднёвай арміі Шанхай, вынікі якой пакуль што ня можна прадбачыць, прыймаючы пад увагу несталасьць і прадажнасьць кітайскіх гэнэралаў. Але адно толькі можна сканстатаваць, што Пэкіну, як асяродку антыбальшавізма, не пагражае ніякай небясьпекі. Усе далейшае залежыць ад разважнай тактыкі Чанг-Тса-Ліна і таго, у якой меры яго падтрымаюць вялікія дзяржавы. Перамога Чанг-Тса-Ліна гэта перш-наперш паражэньне бальшавізму і маскоўскіх уплываў у Кітаі.

N.

Пашырайце роднае слова!

Забойства у сав. пасольстве у Варшаве.

У дню 2 верасьня каля 11 гадзіны рана ў савецкім пасольстве быў замардаваны польскі грамадзянін, нейкі Язэп Трайковіч пры наступных абставінах, як аб гэтым паведаміла праз варшаўскую прэсу радавае пасольства. „Да савецкага пасольства зайшоў нейкі інтэрэсант і, зьвярнуўшыся да швэйцара Шлетцэра, пажадаў пабачыцца з заступнікам пасланніка Ульянавым. На запытаньне, ў якой справе, прыбыўшы быццам пачаў сварку, а затым накінуўся з нажом на швэйцара і раніў яго ў твар. Затым кінуўся ўцякаць, але ня могшы адкрыць дзьверы, якія аўтаматычна зачыняюцца, выняў з кішані рэвальвэр. У гэты момэнт саскачыў з тэлефоннай будкі другі савецкі служачы Гусеў і пяцью выстраламі з рэвальвэру загардаваў на месцы незнаёмага скандаліста. Пры замардаваным былі знойдзены дакумэнты на імя Язэпа Трайковіча, фінскі нож і **барабанны рэвальвэр без патронаў.**“

Гэтак прадставіла фактычны бок таемнічага замардаваньня Язэпа Трайковіча радавае пасольства. Але зусім інакш высьвятлены гэты факт навочнымі сьведкамі, якія на шчасьце аказаліся ў гэты момэнт у радавым пасольстве і самымі забойцамі — Шлетцэрам і Гусевым.

Язэп Трайковіч.

Замардаваны ў радавым пасольстве Язэп Трайковіч радзіўся ў Вільне ў 1907 г. У трагічны дзень лічыў 20 г. і 7 мес. Бацька яго па прафэсіі адвакат, быў багаты; меў 7 дамоў у Пасьпешках (дачная мяйсцовасьць каля Вільні) і маемасьць у Расеі. У 1915 г. перад нямецкім наступленем ён з усей сваёй сям'ёю, складаючайся з жонкі, трох старшых сыноў апрача Язэпа і двух дачок, выехаў у Расею і жыў у Экатэрынаславе. Падчас бальшавіцкай рэвалюцыі два браты Язэпа былі замардаваны бальшавікамі. Гэта зрабіла моцнае ўражаньне на маладога Язэпа. У 1921 г. пры паввароце да Польшчы ў Баранавічах памёр яго бацька, а скора памерла і матка. Цяпер ён мае старшага брата, хворага на сухвоты і двух сясьцёр. На яго імя запісаны 4 дамы, якімі ўпраўляе апякун. Язэп Трайковіч заўсёды праяўляў адзнакі нэрвовага растройства. Ен жыў у Вільні і адтрымаўшы 230 зл. арэнды за дамы, выехаў у Варшаву. Я. Трайковіч быў польскім грамадзянінам, праваслаўнага веравызнаньня.

Абставіны замардаваньня Я. Трайковіча.

Паводле варшаўскай прэсы і навочных сьведкаў, аказаўшыхся ў часе замардаваньня Я. Трайковіча ў савецкім пасольстве, гэты таемнчы морд прадстаўляецца ў наступным відзе; паштальён Будніцкі, прыпадкова падслухаўшы размову між сабою швэйцараў пасольства, паказвае, што Трайковіч ударыў швэйцара Шлетцэра кулаком у твар і толькі, калі адзін з швэйцараў выняў рэвальвэр, Трайковіч выхваціў складны нож, якім ужо нікога ня мог раніць, бо ўпаў трупам. Гэта пацьвярджаецца тым, што Шлетцэр пры дапросе трымаў пры носе хустачку, з якой капала кроў. Затым характэрны факт, што савецкае пасольства паведаміла, быццам у пасольстве было 20 пасяціцеляў, а запраўды іх было 40. Далей выясьняецца, што Трайковіч зайшоў да пасольства па просьбе аднаго з сваіх віленскіх таварышоў навясьці нейкую спраўку адносна выязду ў Расею. Трайковіч сам ня меў замеру ехаць у Расею. „Ill. Kur. Codz.“ паведамляе, што труп замардаванага Трайковіча валаклі з пакою-пачакальні да выхадной дзьверы, як паказваюць сьляды крыві. Шлетцэр і Гусеў даюць рожныя збіўчывыя паказаньні. Ясна толькі адно, што Трайковіч, ударыўшы Шлетцэра, ўцякаў на вуліцу, але ня мог адчыніць дзьверы, замыкаючайся аўтаматычна пры помачы электрычнага току (зроблена па ўсім правілам будоўлі чрэзвычаек). Значыць ня мог уцячы. Ня было патрэбы страляць у яго і ажно 5 разоў, калі Трайковіч, як паказвае сьведка Шлетцэр, па дарозе кінуў нож, і, як паказвае забойца Гусеў, толькі маніўся лезьці у заднюю кішаню, каб выняць рэвальвэр (і адкуль Гусеў ведаў, што ён ласьне лезе за рэвальвэрам?), і выстраліць яму ў сьпіну. Значыць абсалютна ніякай патрэбы ня было страляць пяць разоў у бязвінную ахвяру. Міністэрства заграніўных справаў было паведамлена аб здарыўшымся факце тэлефонна толькі праз 2 гадзіны, гэта значыць, калі труп бязвіннай ахвяры зусім асьцюдзеў. Чакістам, відочна, патрэбна было, каб пазбавіцца галоўнага навочнага сьведкі. Але ня ўдалося зацерці ўсе сьляды гэтага гнуснага морда якое было зроблена па ўсім правілам мастацтва бальшавіцкай чрэзвычайкі, перанесянай за граніцы радавай Расеі пад відам гэтак званых савецкіх пасольстваў. Судзебнае сьледзтва, бязсумленьня, падыме занавеску над варшаўскім пасольствам і пакажа сьвету, што там робіцца. Гэта будзе лішні штрых да чаго, што было знойдзена ў Пэкінскім і Лёнданскім бальшавіцкіх прытонах, называючыхся ганддёва - дыплёматычнымі прадстаўніцтвамі. Гэта ня толькі ачагі агітацыі, шпіянажу, склады аружжа, але і засьценкі чрэзвычайкі.

ПАКАЗАНЬНЕ СЬВЕДКІ БАГДАНОВІЧА.

Знахадзіўшыйся ў часе забойства ў радавым пасольстве работнік Багдановіч расказвае, „што Шлетцэр, а не Гусеў пачаў першы стрэляць у Трайковіча і што толькі ў асабістай абароне Трайковіч выняў нож, якім ня мог нікога раніць“. Сьведка гэтай сцэны Багдановіч у баязьні перад помстаю з боку савецкіх служачых уцёк.

ТАЙНА ЗАМАРДАВАНЬНЯ ТРАЙКОВІЧА.

Віленская газ. „Słowo“ паведамляе на падставе баданьня з сьведкаў быўшых у радавым пасольстве, што Трайковіч не нападаў на Шлетцэра з нажом, і што першым пачаў стрэляць у Трайковіча Шлетцэр, а Гусеў потым дабіў аго ляжачага 4 выстрэламі. Затым Шлетцэр раніў сам сябе фінскім нажом, які затым быў падкінуты да замардаванага Трайковіча. Паводле той-жа газэты ходзяць чуткі быццам Трайковіч паехаў да Варшавы не па сваім асабістым справам, а па жаданьню і ў кампаніі бальшавіцкага правакатара, працаваўшага сярод віленскай эміграцыі і быў ім абманна уцягнуты да радавага пасольства.

СЭНСАЦЫЙНЫЯ РЭВЭЛЯЦЫІ.

Следства ў справе замардаваньня Трайковіча ў савецкім пасольстве прыймае характар скандалу. Следства выказала, што Трайковіч мае абедзьве прастрэчяныя рукі, дзеля чаго зьяўляецца прыпушчэньня, што Трайковіч бараніўся і засланяўся рукамі. Газэта „A.B.C.“ зьмяшчае сэнсацыйную рэвэляцыю, што пісьмо, пісанае быццам паней Кендзерскай да Трайковіча з Варшавы да Вільні, было падроблена, бо пані Кендзерская да нікога не пісала.

ТАЙНА ФІНСКАГА НАЖА.

„Głos Prawdy“ піша: „усе абставіны следзтва ўказваюць па тое, што фінскі нож, знойдзены пры трупе Трайковіча, ня быў яго уласнасьцю, а быў падкінуты на мейсца забойства, бо ня можна сабе вообразіць, каб хто хадзіў з фінскім нажом бяз ножнаў. А між тым ножнаў пры забітым ня было знойдзена. На вастрыі ножнаў ня было ніякіх крывавых сьлядоў. Толькі малая крывавая плямка была на ручцы нажа“.

ПОЛЬСКАЯ ПРЭСА АБ ЗАБОЙСТВЕ.

Кракоўскі „Ilustrowany Kur. Codz.“ (№ 246) піша: „з кожным днём усё больш даных указвае на тое, што ахвяря бэстыяльскага праступленьня ў сав. пасольстве была зьнішчана сьвядома. „Чрэзвычайка“ у Рымскім гатэлю пакончыла з нявыгадным расейскім дзеячом, а затым манілася зацерці сьляды катаваньня ахвяры, але на шчасьце загадка з кожным днём пачынае высьвятляцца і абвінавачывае пэрсональ пасольства“.

„Kur. Por.“ (№ 247) піша: „праступленьне, дакананае над грамадзянінам Польскай Рэспублікі Трайковічам у гмаху савецкага пасольства ў Варшаве выклікала зусім зразумелае зацікаўленьне і зьдзіўленьне сярод грамадзянства, якое ўважна і з непакоем сачыць за ходам сьледства, энэргічна вядзенага судзебным сьледавацелем Вітуньскім пад кіраўніцтвам пракуратуры.

Апошнія навіны.

З Польшчы.

АСУД ГЭН. ЖЫМЕРСКАГА.

Гэн. Жымерскі, абвінавачаны ў грашовых праступленьнях на службе, прыгавораны варшаўскім ваенным судом на 5 гадоў катаржнай турмы з пазбаўленьнем афіцэрскай годнасьці.

ПОЛЬСКА-ЛІТОЎСКІ ПАГРАНІЧНЫ КАНФЛІКТ.

Нядаўна літоўская пагранічная варта захапіла з польскай тэрыторыі польскіх грамадзян: Яблонскага і Пятроўскага. Польскія ўлады патрэбавалі ад літоўскіх уладаў звароту ўведзяных асобаў. Дзеля таго, што літоўскія ўлады не далі задавальняючага адказу, польскія ўлады, паводле літоўскіх афіцыяльных вэрсыяў, зажадалі выясьненьня ў працягу 48 гадзінаў. У зьвязку з гэтым літоўскае міністэрства заграніўных справ ў далучыла вэрбальную ноту пратэсту ўсім акрэдытаваным пры літоўскім урадзе прадстаўнікам заграніўных дзяржаваў проці 48 гадзінага ўльтыматума Польшчы, выстаўляючы гэты факт перад публічнай апініяў Эўропы, як быццам новую небясьпеку вайны. Яблонскі ў свой час быў завочна асуджаны літоўскім судом на сьмяротную казьнь за удзел у польскіх атрадах, бароўшыхся з літоўцамі.

ПАТРЫЯРХ КІРЫЛА V.



Амаль найстарэйшым духоўным на сьвеце быў памёршы цяпер ў Эгіпце кантыйскій патрыярх Эгіпту, Судана і Абісыніі Кірыла V, які пражыў 100 гадоў, з якіх 53 быў патрыярхам.

Ураджай 1927 г.

Галоўны статыстычны ўрад падае, што ўраджай гэтага году будзе большы, чым у мінуўшым годзе. Пшаніцы будзе сабрана каля 13,8 мільёнаў квінталяў, у той час; як у мінуўшым г. 12,8 мільён. кв. Жыта — 59,3 міл. кв. (1926 год — 50,1), ячменю — 17,1 міл. кв. (1926 г. — 15,5), аўса каля 32,6 міл. кв. (1926 г. — 30,5 міл. кв.)

СТЫХІЙНАЕ БЕДСТВА У ГАЛІЦЫІ.

У ноч з 30 на 31 жніўня ў Львоўскім і Станіслаўскім ваяводзтвах праліўны дождж спавадаваў разьліў рэк Сана, Днестра, Тысьменіцы і цэлага раду іх прытокаў. Вадою залігы палі, вёскі і нават месты. У многіх мейсцах размыты жал. дарожныя насыпі і зьнесены масты. Насяленьне ў паніцы кідала сваю маемасьць на волю лёса і ратавалася на ўзгорках. У некатарых местах жыхары ратаваліся па стрыхах. У Барыславе разбурылася 12 дамоў, з якіх 7 каменных, з пад руінаў якіх выцягнута 6 трупаў. Камунікацыя на многіх участках львоўскай і станіслаўскай дырэкцыяў устрымана. Залітыя вадою шахты ў Барыславе. У Даліне заліта вадою каля 100 дамоў. У косаўскім павеце заліта вадою 600 дамоў. З залітых дамоў выцягнута некалькі трупаў. У Крывароўні вада разбурыла 7 дамоў. 6 асобаў ўтанула. У Жабю разбурана некалькі дамоў і затанула 9 асобаў. У Перамышлі гэтак сама шмат дамоў заліта. Ровень вады ў р. Сане падняўся на 7 мэтраў вышэй нармальнага. Матэр'яльны ўбытак вельмі вялікі. У зьвязку з гэтым адбылася 1 верасьня надзвычайнае паседжаньне рады міністраў, на якім ухвалена асыгнаваць грашовую запамогу для ахвяраў паводкі. Апрача гэтага вызначаны спэцыяльны камітэт пры радзе міністраў, які займецца гэтаю справаю.

Выпадак на манэўрах.

На ваенных манэўрах каля Галіча ў Усх. Галіцыі нядаўна здарыўся наступны выпадак, заледве не пацягнуўшы за сабою вялікіх ахвяраў: Пры стральбе з гарматаў быў прысутны камандзір VI Корпусу Акругу гэн. Сікорскі, быўшы прэм'ер, з сваім штабам. І вось недалёка ад гэтай групы вышэйшых штабных афіцэраў упаў баявы снарад. Арыентуючыся хутка ў сытуацыі, ўсе яны ўпалі на зямлю і дзякуючы гэтаму ўратавалі сваё жыцьцё, бо снарад запраўды ўзарваўся, ня прычыніўшы нікому шкоды. За тое другі снарад адарваў тэлеграфісту галаву.

ЛІКВІДАЦЫЯ ІНЦЫДЭНТУ У СПРАВЕ КАВЭРДЫ.

Маскоўскія „Ізьвесьця“ зьмяшчаюць камунікат камісарыяту заграніўных справаў

Алесь Гарун і яго творчасьць.

(Літэратурны нарыс).

Канец.

(Глядзі № 27 „Белар. Слова“).

„МАТЧЫН ДАР“.

Першым і нажаль адзіным дасюль зборнікам песьняра, выяўляючым першародныя літэратурныя вартасьці, зьяўляецца: „*Матчын дар*“, названы гэтак відаць таму, што ахвяраваў яго Гарун сваей маці, як гэта бачым з прысьвячэньня на першых бакавінках кніжкі. Зборнік гэты, як мы ўжо адцемілі рачэй, рыхтаваў Гарун да друку яшчэ ў Сыбіры, падчас працы на рацэ Лене і ў 1914 годзе паслаў яго у Вільню дзеля выдрукаваньня. Выдаць зборнік манілася „*Беларускае Т-ва*“ *ў Вільні*, але пачаўшаяся вайна перашкодзіла гэтым намерам і толькі чэраз чатыры гады — ў 1918 годзе, выдрукавала яго „гражданкай“, коштам Народнага Сэкрэтарыяту Беларусі, друкарня Я. Грынбліта ў Менску.

Зборнік „*Матчын Дар*“, абыймаючы 125 старонак павялічанай васьмёркі, зьмяшчае у сабе поэзыі песьняра, пісаныя у засланьні у пэрыядзе 1907 — 1914 году, значыцца ад часу ягонага арышту да выбуху сусьветнае вайны.

Ня гледзючы на буйны, прыемны для вока друк кніжкі яна мае ў сабе шмат заганаў тэхнічнага характару, якія псуюць ўражаньне чытальніка, а на'т робяць амаль што немагчымым чытаньне яе праз чалавека, слаба азнаёмленага з беларускай мовай. Справа ў тым, што акрамя выдатна — „прадваеннага“ правапісу аўтара, друкарня ня мела ня толькі кароткага беларускага „ў“, але на'т ужыванага падчас і ў расейскай мове „ё“, друкуючы зьмест іх „у“ і „е“. У рэзультаце ўвесь зьмест зборніка моцна скалечаны, цяжкі у чытаньні *і неабходным зьяўляецца новае яго выданьне з перапраўленым правапісам*, што тым больш пажадана „бо першае яго выданьне даўно ўжо разыйшлося і яго нямашака у прадажы! І найлепшым ушанаваньнем памяці Гаруна ў Вільні у нядаўнішнія 40-ыя ўгодкі ягонага нараджэньня было б ласьне гэткае новае выданьне „Матчына Дара“ дый іншых ягоных твораў, але з гэтым дык ніхто не парупіўся!

Увесь зборнік падзелены ёсьць на тры часткі:

1) „*Роднаму краю*“, але дзеля таго, што кожная частка мае мяшаны, больш-менш аналёгічны з іншымі дзьвюма зьмест, дык у першую пару трудна дэтальна сьцеміць, якімі прынцыпамі кіраваўся аўтар пры падзеле. Хутчэй ўсяго ў аддзеле І-шым: „*Роднаму краю*“, аўтар хацеў сабраць вершы патрыятычныя, у аддзеле II гім: „*На чужыне*“ — настроі свае у засланьні, у III-цім: „*Прыявы роднага*“ — малюнкі з жыцьця беларускай вёскі і абразы роднай прыроды, так, як уяўняліся яны Гаруну ў ягоных лятуценьнях на чужыне...

А цяперака спыніліся праз момант на паасобных вершах зборніку.

Вось-жа асаблівым хараством формы, або глыбінёй ці арыгінальнасьцяй думкі вызначаюцца наступныя вершы: прадусім ўступверш зборніку — поэтыцкае *confiteor* песьняра: „*Людзям*“ (ст. 5) — нязвычайна пявучы, інтымны, хапаючы за сэрца верш — скарга, далей *ў аддзеле І шым*: 1) „*Хай ня льюцца*“...— нешта, быццам кліч *de profundis*, быццам малітва за бяздольную Беларусь, якую ўзносіць поэт, бы біблійны прарок за укрыжаваны свой народ; пачынаецца верш гэтак:

„Хай ня льюцца дажджы цёмна-хмарныя,
„Над зьмярцьвелаю пашаю.
„Хай пачнуцца гады хлебадарныя
„Над зямелькаю нашаю,
„Хай красуецца жытам, пшаніцаю,
„Каласочкамі цяжкімі,
„Хай узмацуецца Боскай правіцаю,
„І Ўсетворчымі ласкамі“ .. і г. д. і г. д.

2) „*Ты мой брат*“... (ст. 16) — патрыятычны наказ беларускаму народу аб пашане да роднае мовы, таго адзінаго скарбу, які ад дзядоў і прадзядаў захаваўся „у сялянскай аграбленай хаце“ Беларуса; пісаны быў гэты верш з нагоды чатырохлецьця „*Нашае Нівы*“ настарэйшай, калі ня лічыць „Нашай Долі“, беларускай, лягальнай газэты, 3) пяруновы верш „*Юдам*“ (ст. 18), які прыходзіцца з радні кумаліну вершу „Ворагам беларушчыны“, толькі калі тамака пераважае тэма распрацована у плошчы прадусім соцыяльнай. Акрамя гэтых заслугоўвуюць на увагу „Nocturno“ (ст. 50); вось адрывак з яго:

„... Стаіць магучы лес, ізноў убраны
„У зялёны ліст дагадлівай рукой,
„І п'ець спажыўны клек, старыя гоіць раны
„Зіма, якая моц! Зірні, які спакой!
„Што год ўміраець ён парой асеньняй,
„Каб зноў аджыць, убачыўшы вясну.
„І гэтак ўсё ідзець чаргою пераменнай:
„То скіне сон з вачэй, то зноў ідзець да сну“...

Раяшнік.

(Крыху аб бальшавіках, аб нотах і аб нашых клапотах).

Вось вам Польшча, а вось — граніца, а вось „саўдэпская“ сталіца...

Туды-сюды-ноты... ноты... хоць чытаць няма ахвоты, хоць ты вер ім, хоць ня вер — з Крамлю шлюць усё ў Бэльвэдэр...

У Бэльвэдэру-ж крахцяць, мнуцца, эмігранты-жа трасуцца...

Хай Бог крые?!—кожны ўзвые, як з саўдэпскае „чэкі“ зноў прышлюць бальшавікі — новы сьпісак высяленцаў...

Уратуй-жа, Божа, тых младзенцаў! ..

А вось сьпіскаў рэзультаты: пакідаюць свае хаты і ўжо з крыўдай на Варшаву — ў па-за Польскаю дзяржаву выежджаюць маскалі...

Вось ты тут і разьбяры?!..

Хто з іх праў, ці хто ня вінен, а пакінуць нас павінен..

Ці ты вораг, ці прыяцель, а на т можа абывацель —

А на ліквідацыю тры „добы“ і бывайце ўсе здаровы!..

І хоць ты трэсьні, хоць ты плач, а выяжджай і ты Дзяргач.

Хочаш у Гданск, валяй з „экспрэсным“, з Гданска ў Тчэў сядай з „пасьпешным“...

А з Крэмлёўскае чэкі нясуцца голасна „хі-хі“...

А на наш пратэст у Жэнэву нямашака а ні якога гневу. Відаць па душэ прыйшлося і нічога сказаць не знайшлося.

Але кажа прыказка народа, што маўчаньне—гэта згода.

А ягомасьць „спадарская“, атрымаўшы па твары, каб за гонар ужо свой заступіцца — нагамі, партфэлем стаў біцца, а пасьля на ратунак пабег у „пастарунак“...

Консэквэнтна і інтэлігэнтна!

Відаць што „спадар“ ён шчэ новы і гонару кодэкс яму не знаёмы, бо на абразу рэагаваў-бы не па „вейску“, а па эўрапэйску.

пад загалоўкам „Ліквідацыя інцыдэнту ў зьвязку з забойствам т. Войкава з народнага камісарыяту заграніўных справаў“, які пануе, што вярнуўся да Масквы Польскі пасланнік Патэк і меў 26 жніўня доўгую гутарку з Чычэрыным. У віду таго што спорныя цункты, якія вынiклі ў зьвязку з забойствам прадстаўніка С.С.Р.Р. у Польшчы памысна вырашаны к абаюднаму задаваленьню, камісарыят заграніўных справаў лічыць інцыдэнт гэты зьліквідаваным. У зьвязку з гэтым у бліжэйшыя дні будуць узноўлены гутаркі аб гарантыйным пакце і гандлёвым дагаворы між С.С.Р.Р. і Польшчаю

З ЗАГРАНІЦЫ.

СЭСЫЯ ЛІГІ НАРОДАУ.

У Жэнэве адкрылася звычайная сэсыя Лігі Народаў з удзелам Брыяна, Чэмбэрлена, Штрэзэмана і іншых міністраў заграніўных справаў.

Выбары у Кляйпэдзе.

Вынікі выбараў у Кляйпэдзе наступныя: Прыймала ўдзел у выбарах 14.591 асоба з 20,100 маючых права галасаваньня. Немцы атрымалі 85 проц., Літоўцы — 15. Кляйпэда па вэрсальскаму трактату, як ведама, была адабрана ад Немцаў і далучана да Літвы.

ЗЬМЯНШЭНЬНЕ АКУПАЦЫЙНАЙ АРМІІ

З Лёндана паведамляюць, што між Англіяй і Францыяй дасягнута згода, паводле якой лік акупацыйнай арміі ў Прырэйнскай вобласьці зьменшаны з 70,000 да 60,000 чалавек. Францыя адклікое 6,800 чалавек, Англія — 1,800 і Бэльгія — 1,100 чал.

ВЫДАЛЕНЬНЕ СКАМПРАМІТАВАНАГА РАДАВАГА ДЫПЛЕМАТЫ.

З поваду кампраміта цыі перад аўстрыйскімі ўладамі ў часе ліпнёвых венскіх непарадкаў радавы прадстаўнік у Вена Берзін будзе ў бліжэйшым часе адазваны с сваей пасады. На яго мейсца высунута кандыдатура цяперашняга радавага прадстаўніка ў Пэрсыі Юрэмеца.

ЗАВАСТРЭНЬНЕ АНГЛІЙСКА-РАДАВАГА КАНФЛІКТУ.

Апошнія артыкулы ўрадавай бальшавіцкай прэсы констатуюць завастрэньне канфлікту з Англіяй, паглыбленага акцыяй вялікага нафтавага прамыслоўца Дэтэрдынга, які імкнецца ўсялякай цаною да таго, каб зрыў палітычных адносінаў быў дапоўнены зрывам эканамічных адносінаў між С.С.Р.Р. і Вялікабрытаніяй. Для характэрыстыкі радавая прэса прыводзіць дэкляраuыю галоўнага камандзіра англійскаю арміяй ў Індыі Бірвуда, гаворачай, што ня можа быць гутаркі аб разбраеньні народаў і асабліва аб уводзе англійскіх атрадаў з Індыі, пакуль радавая Расея не адмовіцца ад сваіх цяперашніх палітычных мэтаў.

ПРАПАЛА АПОШНЯЯ НАДЗЕЯ НА ІНТРЫГІ.

Перагаворы між радавым урадам і Трэстам Стандард-Ойль—К-о закончыліся поўнай няўдачаю. Радавы ўрад пасьля доўгіх перагавораў адхіліў варункі, запрапанаваныя амэрыканскім трэстам, асабліва ў вобласьці вазмяшчэньня за страты, панесеныя амэрыканскімі ўласьнікамі бакінскіх нафтаных крыніцаў, дзякуючы рэвалюцыі 1917 г. Радавая прэса, выразна незадаволеная гэтым фактам, прыпісвае разьбіцьце перагавораў з Стандард-Ойль - К-о інтрыгам Дэтэрдзінга, які імкнецца да гвалтоўнай бляк ды нафтавай прамысловасьці С.С.Р.Р. для падвышкі сьвятовых цэнаў нафты паводле палітыкі Райяль Дэтч.

ГРОШАУ НЕ ДАЮЦЬ.

На гаспадарчай канфэрэнцыі Кузьняцоў, у гутарцы з сябрамі конфэрэнцыі, заявіў, што няма ніякай надзеі на атрыманьне грашовых пазык у Нямеччыне і Францыі, дзякуючы націску англійскага кабінэту на Францыю і Англію.

Пауночныя войскі пагражаюць Шанхаю.

Паўночныя войскі Чанг-Тса-Ліна знаходзяцца ў 150 кілямэтрах ад Шанхаю. У месьце пачалася паніка. Аб'яўлена дыктатура гэн. Бай-Тзун-Чы.

У ЧЫРВОНЫМ ПЕКЛЕ.

ТЭРОР.

Паводле вестак з Тыфлісу ў працягу апошніх 2 тыдняў арыштавана і выслана да Сыбіры больш 100 грузінскіх палітычных дзеячоў. Частка з іх ўжо растрэляна.

ВАЕННАЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ НА КАУКАЗЕ.

Выканаўчы камітэт Тэрскага вокруга аб'явіў увесь Тэрскі вокруг на ваенным палажэньні ў віду антыдзяржаўнага руху насяленьня.

Непарадкі у Туле.

У Туле выбухлі непарадкі на металічным патронным заводзе. Тоўпы работнікаў выйшлі на вуліцу з крыкамі: „Мы жадаем хлеба! Далоў саветы!“ Міліцыя адкрыла па маніфэстантам агонь. Забіта 15 чал., ранена 22.

СЯЛЯНСКІЯ ПАУСТАНЬНІ.

У Тульскай губ. выбухлі сялянскія непарадкі і анты-радавы тэрор. Замардаваны 4 камуністыя.

РАСТРЭЛ ЗА ПАРАЖЭНЬНЕ.

Ваенны трыбунал у Петраградзе асудзіў на сьмерць бышага палкоўніка чырвонай арміі ОТТО за паражэньне ў часе наступленьня Юдэніча ў 1919 г.

„І ТУТ АНГЛІЯ ВІНАВАТА“.

„Ізвесція“ зьмяшчаюць у зьвязку з замардаваньнем Трайковіча цэлы рад інсынуацыяў па адрэсу Англіі, якая быццам ня хоча дапусьціць да згоды між Рад. Расеяю і Польшчаю. Робіцца гэта якраз у часе сэсыі Лігі Народаў, на якой павінна быць вынесена ухвала па пытаньню аб стварэньні антырадавага фронту.

З Усходняй Беларусі.

БАЛЬШЭВІЯ БУДУЕЦЦА...

У Менску на падворку турмы будуецца новы гмах, у падвалах якога маюцца пакоі з рэшотчатаю падлогаю Пакоі гэты прадназначаны для растрэліваемых.

ВЫСЯЛЕНЬНЕ БЕЛАРУСОУ ДА СІБІРЫ.

Паводле ўрадавых даных у 1926 — 7 г. з Усх. Беларусі выселена на Урал, да Сібіры і на Д. Усход 3,219 беларускіх сямействаў, складаючыхся з 17,535 асобаў. На пасед жаньні цэнтральнага камітэту ў чэрвеню па справам перасяленьня пастаноўлена высяліць у 1927 — 28 г з Усх. Беларусі яшчэ 28,000 асобаў. Лічба гэта паказалася народнаму камісару рольніцтва Рад. Бел. малай і дзеля гэтага пастаноўлена высяліць у гэты час 4 ,000 асобаў.

Гэткім чынам беларусоў высяляюць у Сібір і на Д. Усход, у той час, як лепшую зямлю на бацькаўшчыне выдаюць жыдам з адпаведнымі грашовымі запамогамі. А калі й высяляюць жыдоў. дык толькі ў Крым і на Украіну, ў чарназемныя, ўраджайныя мейсцы.

АКАНОМЯЦЬ НА... ВУЧЫЦЯЛЕХ.

З мэтаю дасягненьня раўнавагі бюджэту Радавай Беларусі радавыя улады ухвалілі зьменшыць пэнсыю народных вучыцялёў да 15 да 50%. Вучыцелі падалі пратэст, які астаўлены бяз увагі.

Чым займаюцца...

На аснове пастановы 8 усебеларускага зьезду радаў, прэзыдыум Цэнтр. К-та Б.С.Р.Р. пастанавіў зацьвердзіць ліквідацыю цэлага шэрагу раёнаў Менскага, Бабруйскага, Полацкага Мазырскага і Гомельскага вакругоў, якія не апраўдалі сябе з гаспадарчага і культурнага пункту гледжаньня. Тэрыторыі зьліквідаваных вакругоў будуць прылучаны да суседніх раёнаў. Ліквідацыя раёнаў павінна быць закончана да першага верасьня г.г.. Ці не пара ўжо саміх сябе зьліквідаваць?!...

ЖЫЦЬЦЕ ПРОВІНЦЫІ.

ГОРАДНЯ

Яшчэ ня так даўна гаварылі і пісалі ў тутэйшых газэтах, што прытулак ў Горадні для беларускіх дзяцей даканчвае сваё жыцьцё і усе чакаюць яго зьлікв даваньня і г. д. Гэтаму было прычыною тое, што адміністрацыя прытулка, а так сама і беларускае Т-ва ў Горадні махнула рукою ча гэты прытулак і аднасілася да яго неспагадліва. Хаця на падтрыманьне гэтага прытулку шло шмат грошаў, але істнаваньне яго было нямоцным. Дайшло да таго, што гэты прытулак насіў адну толькі назву прытулка. Ен ледзь дышаў і яму пагражала небясьпека быць зачыненым. Гаварылі нават, што мясцовая Улада хоча прытулак зачыніць, а дзяцей пераздаваць па польскім прытулкам. Вось гэтыя абставіны, відочна, і надаўмілі тутэйшых беларусаў заняцца бліжэй лёсам прытулку. Знайшліся добрыя людзі, якія штырхнулі мясцовыя магістрат умяшацца ў жыцьцё гэтага прытулка. Дзякуючы гэтым людзям, магістрат ўзяў прытулак пад сваю апеку і вызначыў свайго кіраўніка па гаспадарчаму аддзелу. Беларусы так сама заварушыліся ў апошні час Яны прыйшлі да пераканаўньня, што жыцьцё прытулку ненармальна і што трэба што-небудзь рабіць. І вось нядаўна адбыўся агульны сход беларускага Т-ва ў Горадні, на каторым выбралі новы ўрад з асобаў, карыстаючыхся даверрам як ўлады, гэтак сама і грамадзянства. Новы ўрад ужо ўзяўся за ачышчэньне адміністрацыі прытулку ад непатрэбных і шкадлівых элемэнтаў. Есьць надзея, што жыцьцё прытулка стане на добры шлях і палепшае, і што яго істнаваньне будзе загарантавана, бо яго лёсам зацікавіўся і наш епіскап Аляксей.

Горадзянін.

Euthanasia.

(*З Байрона.*)

Калі, закончыўшы жыцьця свайго заданьне,
Скажу сабе: пара спачыць мне вечным сном, —
Ў той час мой водр сьмяротнага змаганьня
Прыкрый, салодкая, няпамяць, бы крылом!
Ня трэ мнэ тых, хто лас маёй худобы,
Ні тых, каму шкада са мною разьвітацца!
Ні кос распушчаных, з якімі ў знак жалобы,
Жанчыны і дзяўчаты любяць нам казацца.
Няхай зыльлюся я ў цішы з зямной скудзельлю,
Бяз сьлёзаў жальб хаўтурных, бяз хвальшы галасной.
Ня стаўшы перашкодай кагосьці там вясельлю,
Настрою не папсуўшы няпрошанай сьлязой.
Аднак жа, каб каханьне ў гэты час застацца
Спакойным-бы магло і ўздых ў грудзёх спыніць —
Уся моц яго магла-б' й ўлада тут сказацца,
Над тым, хто шчэ жыве, і тым, хто йдзе спачыць!
О, як было-б салодка ўбачыць мне, Псыхэя,
Што ты глядзіш да конца і ясна і сьвятло:
Цярпеньне-бы само зьмянілась ўраз надзеяй,
І з сьмехам шчасьця ў край лепшы адыйшло!
Але дарэмна! Адыходзіць пекнасьць мімаволі
У такт дыху, што бяжыць ад нас,
І сьлёзы дзеўчыны цякуць што быццам з болю,
І лгуць ў жыцьці і сілы адымаюць ў наш сьмяротны час!
Няхай жа не спыняецца апошняе дыханьне
Прысутнасьцю людзей і гукам жальбы слоў;
Бо-ж сьмерць ня ёсьць і не павінна быць чаканьнем,
Туга-ж зямлі — няведама для іх грудзёў!
Але, памерці! Назаўсёды, на векі адыйсьці
Туды, куды адыйдзе кожны твор быцьця,
Ізноў нічым тым стацца, чым ён быў калісьці,
Прад тым, як ў сьвет зьявіцца для гора і жыцьця!
Зьлічы ўсе радасьці, што на жыцьця банкеце,
З чары зямлі шчасьця прыйшлося табе піць:
Зьлічы і праканай-ся, хто-б нібыў ты ў сьвеце —
Есьць нешта больш прыемнае: н я б ы ц ь!

Б. Друцкі.

Адбудова дарогау у Наваградчыке!

Ад 1 кветня 1927 да 15 чэрвеня г г. 5 доўорцаў дарогавых ад гміны Дзятлаўскай правадзілі напраўкі вясковых дарог. Зроблена 16 цэмэнтовых мастоў, зроблены брукі ў вёсках Савічы, Парэччэ (у якой яшчэ робіцца) і Развамса. Папраўлены дарогі з в Нарчэвічы да Аханову, з в. Страла да Крагаяны з в. Засеці да Нарчэвічаў, з м. Дзятлова да Пецюканаў. з п. Дзятлова Ятвезь і в. Дзятлова ў в. Парэчэ — Дзятлова, Савічы, Трухановічы Вензовец, Рапіпе. Дзятлово—Дворэц, Савічы, Петрукі. Зроблена болей

— у апошніх двух радках бачым, вельмі характэрную для сьветагляду Гаруна галоўную тэзу ўсяго гэтага твору: ўсе на сьвеце мінае, усё ідзе сваем адвечным чарадом, чалавек мусіць пагадзіцца з непарушнымі законамі прыроды. *Ноч* (ст. 65) магутны крык адчаю, тыганічны бунт, скоганае няволяй энэргіі, арліны парыў у высь, найпрыгажэйшы мо' верш Гаруна; вось яго пачатак:

„Ў гэту ноч мне ня ў моч —
„Німа сілы чакаць і маліцца..
„Каб я ўмеў, каб я сьмеў
„Узьляцець, паляцець ці разбіцца!

і далей:
„Як сакол, як арол
„Я падняўся-б высока страшэньне
„Я-б узяў, я-б украў
„І сабе і усім адпушчэньне“...

. . . .
. . . .
. . . .

...Гэтым канчаем агляд „Матчына дару“

Пазьнейшыя вершы песьняра не ўвайшлі у зборнік і блутаюцца і дасюль па рожных журналах ды газэтах. Гэтак жа ня выданы дасюль асобнай кніжкай і творы Гаруна прозай як напрыклад: „*Маладое*“ „*Пан Шабуневіч*, „*П'еро і Коломбіна*“ „*Сьвята*“ і іншыя апавяданьні. Абгаварыць іх бліжэй, ня маючы апавяданьняў гэтых пад рукой, ня маем магчымасьці, але ровень іх павінен быць высокі Тое-ж самае можна сказаць і аб сцэнічных творах песьняра, пісаных для дзіцячага тэатру.

Значэньне Гаруна у беларускай літэратуры — аграмаднае! Ен, побач з М. Багдановічам, з'яўляецца адным з тварцоў імпрэсыяністычнага кірунку ў беларускай, адраджонай літэратуры.

Гэта — поэт — інтэлектуаліст, поэт — філязоф, а адначасна з тым мастак слова і містык, які хараством і глыбінёй шмат якіх з сваіх імпрэсыяў ня ўступае самому М. Багдановічу!

Да найбольш характэрных рысак яго най творчасьці, акрамя ўсёабымаючага патрыятычнага пачуцьця, узмацаванага прабываньнем у чужыне і тугой па Бацькаўшчыне, належаць: 1) разьлітая ў большасьці яго ных твораў дэлікатная мэлянхолія, 2) трагічная трактоўка жыцьця і 3) узварушаючая шчырасьць аўтара у выказываньні найбольш патаёмных і балючых думак сваіх.

У тэхніцы вершу Гаруна найбольш задзіўляе чытача нязвычайнае багацьце поэтыцкіх формаў, якога — у гэткай меры — не спаткаем у ніводнага з іншых беларускіх поэтаў таго часу. Гэтак жа мае Гарун свой уласны, надта-ж арыгінальны, паэтыцкі стыль.

Цікаўна адзначыць, што, ня гледзючы на работніцкае паходжаньне Гаруна і ягоную рэвалюцыоннасьць, мы ня толькі што ня можам дагледзіцца ў ім нейкагась пралетарскага „песьняра працы і змаганьня“ у родзе Цішкі Гартнага, але наадварот, бачым у шмат якіх з ягоных твораў даволі моцныя водгукі ідэолёгіі г. з. „беларускіх шляхоцкіх рамантыкаў“ XIX га стагодзьдзя, дый рэвалюцыйнасьць Гаруна мае у сабе шмат з шляхоцкага лібэралізму г. з. „народнікаў„ канца таго ж стагодзьдзя. Уваўсёй поэтыцкай творчасьці Гаруна, за выняткам пяруновага вершу „Юдам“, мы бадай што зусім не спатыкаем гэтак модных у „нашаніўцаў“ нотак соцыяльнай ненавісьці Творчасьць ягоная ідзе пераважна шляхам або патрыятычных перажываньняў, або філязафічных рэфлексыяў. Прычын гэтай, дзіўнай на першы погляд, *памяркованнасьці* рэволюцыянэра — Гаруна трэба шукаць прадусім у тым вялікім ўплыве, які мела на яго польская літэратура, як ведама, наскрозь прасякнутая консэрватыўнай шляхоцкай ідэолёгіяй; акрамя таго мусіла дзеяць на гэткі сьветагляд песьняра і невылечымая яго хвароба — сухвоты.

Уплыў гэты адбіўся і на форме, ці паасобных зваротах нікаторых вершаў, выяўляючыся роўне-ж у шматлікіх полёнізмах Найбольш яскравыя з іх, як напрыклад: „слонца“; „сланэчны“; „гвар“; „крулеўна“ і г. п.,— *пакольку, канешна, гэта не папсуе разьмеру ці рыфмаў вершу* — пажаданым было-б ухіліць у новых выданьнях, заменяючы адноснымі беларускімі тэрмінамі.

Акрамя польскага — можна заўважыць у творчасьці Гаруна невялікі ўплыў літэратуры украінскай, ня кажучы ўжо аб беларускай.

Цікава адзначыць, што першы ацаніў належна творчась А, Гаруна — М. Богдановіч, даючы дужа прыхільны адзыў у зборнічку „*Калядная пісанка*“ (1913 г.) аб ягоных вершах, друкаваных ў „*Нашай Ніве*“. Гэтак спатkaліся і збраталіся пры алтары несьмяротнага хараства душы чорнарабочага і ураджанага інтэлігэнта, зраўняныя і узвышаныя цярпеньнем і адзінотай...

ЯЗЭП СЬВЕТАЗАР.

Канец.

як 7 кілёметраў дарогі. Маёнтак Міроўшчыня дала 268 падводаў і 636 работнікаў, яшчэ застаецца 103 работнікі.

25. VIII. 1927 г. Дзятлава.

„Цікавы“.

15 жніўня г. г. войт гміны Гаготэнскай пав. Слонімскага пан Я. Жых выехаў разам з камэндантам пастарунку м. Раготна на мейсцы пацярпеўшых вёсак сваёй гміны, каб спраўдзіць на мейсцы, каму трэба выдаць ў першую чаргу грашовую запамогу для адбудовы разбураных будынкаў. Сьпісак бедных, пацярпеўшых ад гурагану з дакладам быў прадстаўлены пану старасьце Сабніцкаму, які 18 жніўня, выехаўшы ў гміну Раготэнскую, выдаў 4,000 злотых пацярпеўшым бедным грамадзянам вёскі Явор, Саччэўляны і іншым.

В. Явор 21 жніўня.

„Пацярпеўшы“

Аляхновічы.

(Маладэчанскага павету.)

У нас адкрыўся банк „Стэфчыка“ і пажычаюць ужо грошы сялянам. Пазыку даюць на 3 месяцы, на 12% у год — за 100 злотых плацім 1 злоты ў месяц.

Праз гэты банк ужо выпісалі вагон штучнага гною — тамасоўкі — на пасеў жыта, з выплатай у працягу 9 месяцаў. Цяпер-жа заплацілі толькі 25%

Нашыя дробныя сяляне чакаюць, што скора будзе перадзел зямлі і што ім хоць троха можа, што прырэжуць. Хаця-ж бы за грошы. Але бог ведае, калі гэта будзе і ці дачакаюцца яны.

В. М-лы.

в. Навасёлкі, гм. Ракаўскае.

У нядзелю 28|VIII. адбылося ў Дуброўскай школе арганізацыйнае сабраньне Кулка апякунчай рады наконта дому „Ludowego“ і каб адкрыць чытэльню і бібліатэку. На гэта сабраньне былі запрошаны паасобныя асобы і больш былыя грамадаўцы. Шмат хто баяўся арэшту і ня прыйшоў. Як адкрылі сабраньне, войт гміны паясьніў, як і што гэта будзе, але на польскай мове і большасьць пачала прасіць, каб ператлумачылі нам па беларуску, але ніхто не ператлумачыў. Запрасілі запісвацца ў сябры. Некатарыя з пісаліся, але, як адбыўся выбар „зажонду“, то сталі выкрэсьляцца за несправядлівыя выбары, дзеля таго, што сабралі вучняў і галасавалі як хацелі і лічылі як хацелі. Пасьля выбара агульным сабраньнем быў абсуд сяброўскіх ўзносаў. Пастанавілі ў месяц 30 грошаў. На гэтым сабраньне і закончылась.

К. Т-ль.

К угодкам істнаваньня касы.

Коопэратыўная Каса Стэфчыка ў м. Дзятлаве пав. Навагрудзкага, адчыненая 3 верасьня 1926 года, цяпер лічыць 469 сябраў, паевы капітал складае 11,500 злотых, упісны капітал — 1,100 злотых, агульных выданых пазычак 85,300 злотых.

Цяпер было высланых для пазычкі пацярпеўшым ад граду 24,600 злотых. Ня выдана рэшта грошаў дзеля таго, што гэта пазычка была выдана для касы да 15 лютага 1928 г. і насяленьне, ўцяміўшы, што ў самы трудны мамэнт прыдзецца заплаціць падпісаны вэксель, у большай сваёй часьці гаварыла, што ляпей будзе браць на сеўбу жыта.

Каса ў сувязі з камітэтам гміны закупіла сеўнае збожжа для выдачы зярном на пасеў і ўжо паехаў сябра гміннага камітэту п. Русін закупляць збожжа. Каса мае яшчэ атрымаць на сеўную пазычку 47,000 злот. для выдачы ў першую чаргу люднасьці, пацярпеўшай ад граду.

Каса працуе два разы ў тыдзень — сераду і суботу. Пай 25 злотых упісаны ў сябры касы. Грошы можа атрымаць кожны грамадзянін, прачытаўшы ўставу касы.

„Сябра касы“

24—VIII—27 г.

Навальніца.

Навальніца 14 жніўня г. г. прычыніла вельмі многа шкодаў сялянам Ярэміцкае гм. Стаўпецкага павету.

Гэтак у вёсцы Лядкі забіты маланкай гр. Міхал Нечай і Алеся Губрык, кантужаны гр. Губрык, а яго дачка паралізавана. У в. Новае-Сяло згарэла хата, хлявы, гумно, адрынка і 6-ці гадовы хлапец. У м-ку Турэц згарэла гумно, ў в. Вобрыне — гумно, у в. Слабада-Сіняўская—гумно і ў аднаго гаспадара з в. Загора забіты конь.

Дзеля таго, што ў гэты час усе сяляне паўвозілі ў гумны збожжа і сена, дык шкоды, прычыненые громам 14 жніўня г.г., вельмі аграмадныя У іншых гмінах нашага павету навальніца прычыніла значна менш шкодаў і гэта мусіць дзеля таго, што сяляне некатарых вёсак паставілі грамаадводы.

Cer-tus.

Тутэйшая хроніка.

— ЗВАРОТ ВАЯВОДЫ п. В. РАЧКЕВІЧА. 6 верасьня вярнуўся з урлёпу віленскі ваявода п. В. Рачкевіч і 7 прыступіў да выпаўненьня сваіх абавязкаў.

— З ЖЫЦЬЦЯ БЕЛ. НАЦ. РАДЫ. Прыходжане Мураванскай парафіі з Лідчыны прыслалі заяву да Старшыні Беларускай Нацыянальнай Рады са шмат подпісамі і просяць аб адчыненьні Царквы. Заяве ўжо дадзены ход і п. Паўлюкевічам прадпрыняты крокі ў уладаў, каб дапамагчы парафіянам у гэтым кірунку.

Мураванская параф'я мае 15 вёсак і каля 3000 праваслаўных жыхароў. Каталікоў зусім мала, а тым часам Царква, якая больш як 500 гадоў істнавала ў сучасны момэнт, у час бязьверра, камунізму і атэізму — ня ведама з якіх прычын уладамі зачынена Гэтак пішуць прыхаджане. Здавалася-б, што галоўным сродкам барацьбы з узрастаючым бязьверрам і, зьвязаным з ім камунізмам, іменна ёсьць рэлігія і выхаваньне моладзі ў рэлігійным духу і ня будзе нічога надзвычайнага, калі улады прыхіляцца да просьбы прыхаджан і спыняць забарону маліцца ім у сваёй Царкве.

— БЕДНЫ МАКАР! Звольняны з рэдакцыі „Беларускага Дня“ і „Беларускай Культуры“ Макар Косьцевіч (Макар Краўцоў) зьвярнуўся да інспэктара працы з просьбаю ўплынуць на рэдактара гэтых часопісаў п. Умястоўскага, каб ён выплаціў адшкадаваньне з поваду звальненьня яго „бяз мундзіра і пэнсыі“. Бедны Макар! Зноў пасыпаліся на яго шышкі... А здавалася, гэтак чуў сябе моцна на „новым“, „цёплым“ месцы! Аказваецца нішто ня вечна ня толькі пад месяцам, але нат' пад „Дзенным“ сонцам.

— У КЛЮБЕ БЕЛ. ІНТЭЛІГЭНЦЫІ. Сябра-залажыцель „Клюба Беларускай Інтэлігэнцыі“ п. Г. Канапацкі падаў заяву аб выхадзе з ліку сябраў гэтага клюбу.

—ПАВЯЛІЧЭНЬНЕ ЛІКУ БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЭНЦЫІ. У Вільню прыехаў з Прагі чэскай пасьля аканчаньня вышэйшай адукацыі інжынэр-аграном Б. Малевіч.

— ЗЕМЛЯРОБСКАЯ ВЫСТАВА ў КРАСНЫМ. Дзякуючы стараньню Маладэчанскага павятовага Сойму, а таксама земляробскага саюзу гурткоў і арганізацыяў на Віленшчыне, 15 верасьня 1927 года будзе з'арганізавана ў м. Красным над р. Вушаю выстаўка коні і быдла, а таксама рэчаў народнага промыслу. Пасьля выстаўкі адбудуцца конскія бягі. Запісывацца на выстаўку і атрымліваць усякага роду паясьненьні можна ў павятовым аддзеле Маладэчанскага Сойміку (дом старосты), ў павятовага агранома ў Маладэчне, ў магістраце места Радашковічы, а таксама Ракава і ў гмінных урадах Маладэчанскага павету. За асабліва выдатныя жывёлы, а таксама за рэчы народнага промыслу будуць выдавацца цэнныя награды ў форме розных земляробскіх прыладаў.

—ЗАПАМОГІ ДЛЯ СЕМЬЯЎ РЭЗЭРВІСТАЎ. Рада міністраў на паседжаньні 29 жніўня ўхваліла распараджэньне аб запамогах для семьяў рэзэрвістаў, пакліканых на вучэньне. Запамогі гэтыя будуць наступныя: для сямьі з адной асобы у вясковай гміне— 60 грошаў у дзень, у малым месьце — 70 гр., у месьце больш 25,000 жыхараў — 90 гр, для сямьі з 2 асобаў гэтыя нормы будуць складаць — 70 гр., 85 гр., і 1 зл. 10 гр., для сямьі з 3 і больш асобаў — 80 гр., 1 зл і зл. 20 гр, у дзень.

—ПАДАТКОВЫ ПРЫМУС. Міністэрства скарбу прыгатавала рашучае распараджэньне, каб набіраць з усею срогасьцю залеглыя падаткі з тых рольнікаў, якія пасядаюць цяпер значныя грашовыя сродкі, аб чым сьведчыць слабае прапазыка збожжа і жаданьне высокіх цэнаў на яго, ня гледзячы на памысны ўраджай гэтага году. Гэта распараджэньне не датычыць мейсцаў, пацярпеўшых ад стыхійных бедстваў.

— АТРУЦЬЦЕ ў 6 ПАЛКУ ЛЕГІЕНАЎ. У 6 палку легіёнаў атруцілася каля 200 жаўнераў са псаванымі кансэрвамі загатоўкі быдгоўскай кансэрвнай фабрыкі. Усе захварэўшыя зьмешчаны ў ваенны шпіталь Сьмяротнага выпадку ня было. Як перасьцярагаючы сродак — увесь полк мусіў прыняць рыцыну. Сярод афіцэраў, не карыстаўшыхся гэтымі кансэрвамі, ніхто не захварэў

— УВАЗЕ ІНВАЛІДАЎ. Найвышэйшы адміністрацыйны трыбунал разглядзеў 13 чэрвеня г. г. (№ 3816/25) справу інвалідаў, зарэгістраваных пры гэтак зв. Францускай рэгістрацыі і вынес пастанову, што гэтая рэгістрацыя дае інвалідам права дамагацца інвалідзкай рэнты. У сувязі з гэтым усе інваліды, якія былі зарэгістраваны пры, гэтак званай, Францускай рэгістрацыі і дагэтуль не атрымаўшя рэнты, могуць нанова пачаць справу ў адпаведным Р. К. U. аб прызнаньні рэнты, паклікаючыся на пастанову найвышэйшага трыбуналу.

— ВЫШАЎШЫЯ З РУХУ БАНКНОТЫ. З 1 верасьня выходзяць з руху паперкі па 10 і 20 зл. з датамі 28 лютага 1919 г. і 15 ліпня 1924 г. Замена іх на новыя будзе адбывацца да 29 лютага 1928 г.

Пісьмо у рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Прашу зьмясьціць у Вашай паважанай газэце наступнае:

„Да Пана Старосты Маладэчанскага павету.

Мацей Пятровіч, старшыня гміннага аддзелу P. S. L. „Wyzwolenie“ у Палачанах.

Дзеля таго, што ўсе сябры гміннага аддзелу P. S. L. „Wyzwolenie“ у Палачанах далучыліся да Беларускай Нацыянальнай Рады і Партыі,—урад аддзелу зьліквідаваўся; далучаючы да гэтага штэмплі гміннага аддзелу P. S. L. „Wyzwolenie“ у Палачанах з мэтаю перадачы ў архіў Маладэчанскага староства, ветліва прашу Пана Старосту аб выдачы мне паквітаваньня.

Палачаны, 25 ліпня 1927 г.

Старшыня аддзелу
(—) *М. Пятровіч*

УВАГА:

26 ліпня г. г. я асабіста перадаў у канцэляры Маладэчанскага староства адносьнік з штэмпелямі ўрада аддзелу P. S. L. „Wyzwolenie“ у Палачанах, але да сянняшняга дня 15 жніўня 1927 г. не адтрымаў паквітаваньня ў адтрыманьні ад мяне штэмпеляў „Wyzwolenia“.

Быўшы Старшыня
Аддзелу „Wyzwolenia“
(—) *М. Пятровіч*“.

З пашанаю
Віцэ-Старшыня Беларускай Нац. Партыі
Мацей Пятровіч.

Паштовая скрынка.

М. Б. Вершы не падыйшлі і надрукаваны ня будуць.

Ал. Радецкі. Грошы атрыманы. Высылка газэты не спынялася. Даведайцеся на пошце.

Міх. Кірылюк, А. Ілынец, Каст. Гоман, М. Похв, Бр. Мініг, М. Яроцкі, Ян Касач, Ант. Раманцэвіч, Яз. Карась, П Жылінскі, М. Казёл, Р. Сьпезьняк, Т Сіманковіч, Д. Касьцюкевіч, Я. Рыдуха, А. Калодка, С. Стэльмах, — пробныя нумары высылаем.

Вял. Кізік, Ул. Савіцкі — 2 зл. атрымалі; газэта высылаецца.

Міх. Кур'яновіч — 1 зл. атрымалі; газэта высылаецца.

АБРАЗОК З САВЕЦКАГО БЫТУ.

Віновая дама.

(З расейскага журналу „Смехач“ № 20).

Усё, аб чым тут гаворыцца — шчырая праўда. Пісьменнікі рознымі вымысламі займаюцца, сябе затрудняюць, непакояцца Верце слову: цёмра наша вясковая — найлепшая выдумшчыца. Гэткое часамі крутане — толькі з дзіву ахнеш!

У Курганскай акрузе вы ніколі не былі? Ну й нятрэба. Аднак, калі незнарокам паедзеце праз Курган, спытайцеся на вакзале аб вёсцы Баксарах. Прост так і кажыце: як гэта там сёлетняй зімой зямлю разыгралі ў карты, ды як гэта віновая дама насаліла ўдаве Тэклі?

Калі скажуць вам — цікаўную будзе чуць гісторыю. А то, можа зусім і гаварыць з вамі аб гэтай матэрыі не захочуць. Дык і ня трэба Я сам вам усё раскажу ўва ўсей падрабязнай паўнаце.

Пачалі гэта ў Баксарах зямлю дзяліць. Перадзел значыцца. Колькі за год калкоў на гэтую справу папсавалі! Дзесяціны дзьве пэўне! Справа простая: як зьбяруцца на сходку дык і пачнуць адзін другога калкамі па галовам частаваць. Вялікія ахвяры панёс народ! Дзеля гэтага самага ніякая ліквідацыя безграматнасьці там не прышчапілася.

Доўга гэткім манерам псавалі казённы лес, аж пакуль прэдсельрады Салаўеў не пакончыў з гэтым. Сабраў ён народ дый і лупануў мову:

— Грамадзяне, а также каторыя ўдовы! Няхай там людзі па едакам, па душам ці па галовам зямю дзеляць! Ад гэтага, як бачыце, адно безпакойства ды крыўда целу выходзіць. А мы зробім так, каб нікаму абідна не было. Кожны чалавек, бядняк там ці серадняк, ізноў-жа і заможны, мае свой лёс, сваю долю. Будзем рабіць на шчасьце. Каму ўжо зроду напісана — вядома. Разыграем зямлю ў .. карты...

Прэдсельрады дастаў з кішані калоду старых засаленых картаў.

Былі сярод народу і такія, каторыя мо' і ўзбурылісь-бы проці гэтага перадзелу. Надта-ж дзіўна выходзіла. Але кулакі ў Баксарах, як пішуць у газэтах, так-жа ня лапцем капусту сёрбаюць, а прэдседацель — зусім ня лыкам шыты. Да зборкі паставілі яны сходу са два вядры самагонкі. Справа прывычная: грамадзянства сёрбанула, закускі ніякай, ну ў галовах у яго і памуцілася.

— Аб'яўляю паседжаньне адчыненым — сказаў прэдседацель. Усе каторыя з'явіліся — прысутны. Тыя, што не з'явіліся — ўчасьця ня прыймаюць. Унашу канкрэтную прапазыку: гуляць у „дваццаць адно“. Прашу трымацца арганізавана: чужыя карты не падглядваць. Слова для здачы картаў мае грамадзянін Петухоў, як асоба, не пазбаўленая выбарных праваў.

Цэлы дзень смаліла грамадзянства ў карты.

Да вечару, калі ўжо пачала цямнець — выявіліся і вынікі: бедната прайграла ўсю сваю зямлю.

Удава Тэкля ходзіць ды галосіць:

„Сьцерва гэтая самая, згубіла мяне! Віновая дама, каб ёй паскудзе ні дна, ні пакрышкі! Была ў мяне дзясятка, ўзяла я да яе гэтую самую даму, і да яе злыдні—бач — туз прыпоўз!“..

У акрузе хутка даведаліся аб гэтай гісторыі. Зьехала рэвізія, прэдседацеля — па шапцы, картачны перадзел адмянілі, а віновую даму да ўсіх чартоў паслалі.

Доўга яшчэ баксарскія мужыкі стыдзіліся і вочы казаць на сьвет Божы. Бывала ў Кургане на рынку з суседняе вёскі спаткае хто баксэрца і дзеля сьмеху пытае:

— „Эй зямляк! падзялілі зямлю? А каму туз дастаўся?“

А той, давай Бог ногі! У завулак завярне або, нібы-та па сваей патрэбе, ў гарадзкое адхожэ шмыгане..

Ч. Рыклін.

Пераклаў *Б. Др.*

Мудрая парада.

(Усходні сказ)

Да мудрага муфцыя *) Магамэта прыйшоў нек з пабялеўшым тварам, панурым паглядам вочаў і зморханы ў канец малады Софта Абдулла.

— Людзі кажуць, што ты мудры чалавек і заўсёды можаш даць мудрую параду, сказаў ён сумным голасам. — Памажы-ж і мне!

— Кажы, сын мой, якую бяду маеш?

— Ды вось — з тэй пары, як я меў няшчасьце пакахаць — абрыдла мне ўсё, ўвесь сьвет. Сьпярша сэрца маё запалыхала магутнай любоўю да дзяўчыны з вачыма як васілёк палявы, шчочкамі бы рожы Шырасу, вуснамі салодкімі бы сьпелыя вішні. Але я бедны і бацька выдаў яе за другога... З тых пор я ненавіджу ўсю прыроду скуль яна хораства свае ўзяла!..

— Гм.. кажы далей!

— Прайшло некалькі месяцаў. Раптам сэрца мае ізноў ускалыхнулася: я палюбіў дзяўчыну з чорнымі бы ноч васеньняя вачыма, косамі бы крыло воргана, вуснамі падобнымі каралям, з тонкім, гібкім, зьмяіным целам. Я быў праконаны, што яна будзе маёй жонкай. Але ў пагожы дзень я даведаўся, што яе заручылі з багатым купцом — гарбатнікам, які прыходзіўся ей па гадох хіба дзедам. І з тэй пары я ненавіджу ўсе царства зьвяроў, бо яно прыпамінае мне адметныя рысы яе ўроды!

— Ты чалавек з лёгікай, сын мой! Аднак-жэ — кажы далей!

— Ня бачучы на гэтыя горкія прыклады я хутка захоплены быў трэцяй пякноткай. Яна мела валосы бы літое золата, вочы — ясныя і бліскучыя бы адшліфаваная сталь, фігуру — бы выкутую з мармуру. І ў гэты раз я так жа пацярпеў няўдачу, і з гэтай пары я ненавіджу ўвесь сьвет!.. Ці-ж няма якога к лечы сродка, каб вылячыць мяне з гэтага сумнага настрою, збавіць мяне ад гэтае журбы? Памагі, калі можаш, о, мудры!

Гм! сказаў муфці сур'ёзным, задумленым голасам. — Канешна, сродак ёсьць. Ідзі і пашукай істоту, якая-б у сябе ўмяшчала ўсе адметныя рысы ўсіх трох царстваў прыроды: расьліннага, мінэральнага і жывотнага.

Абдулла падзякаваў і пайшоў ад мудрэца.

Амаль год кануў у вечнасьць, аж раптам у хату мудрэца ізноў прыйшоў Абдулла.

Муфці ўраз-жа пазнаў яго і пытае.

— Ну?

— Дзякую табе ад шчырага сэрца, о, мудры! жыва пачаў Абдулла Твая парада аказалася цудоўнай! Я знайшоў істоту жаночага роду, якая мела валасы з расьліннага царства, жоўтые бы салома, нос — з царства жывёлы — бы дзюб каршуна, а з мінэральнага — вялізную скрыню, поўную золата і срэбра. На гэтай істоце я і жаніўся ..

— І што-ж? Ты шчасьлівы?

— Але, о, мудры! І вось дзеля чаго: калі мы ехалі пасьля вясельля праз раку, наш чоўн вывярнуўся і жонка мая ўтапілася, пакінуўшы мне ўсё сваё багацьце... Ці не пачаць мне шукаць жонку нанова?

— Шукай, сын мой, шукай! Бо з тым, што табе пакінула ўтопшая жонка, ты будзеш мець пасьпех ня толькі ў трох, але ўва ўсіх царствах прыроды!

Б. Друцкі.

*) Магамэтанскі вышэйшы сьвяшчэннік.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. І. Баеўскага Вільня, Мастовая 9. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.